*Лагуценкава Таццяна Мікалаеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №1 г.Бялынічы імя М.І.Пашкоўскага”*

**Майстар-клас**
**«Метады, формы і прыёмы працы з тэкстам на ўроках мовы і літаратуры дзеля развіцця крытычнага мыслення і развіцця функцыянальнай адукаванасці вучняў”**

**Мэта:** знаёмства з метадамі, формамі і прыёмамі працы з тэкстам на ўроках мовы і літаратуры дзеля развіцця крытычнага мыслення і развіцця функцыянальнай адукаванасці вучняў.
**Задачы:**
павысіць эфектыўнасць работы настаўнікаў у дадзеным накірунку;
удасканальваць уменні педагогаў у арганізацыі вучэбнай дзейнасці;
абмяняцца эфектыўным вопытам арганізацыі і правядзення ўрокаў.
**Форма правядзення:** майстар-клас.

1. Уводзіны ( абгрунтаванне выбару тэмы, яе актуальнасці для настаўнікаў; азнаямленне ўдзельнікаў з этапамі работы; кароткае апісанне зместу дзейнасці).
2. Знаёмства з формамі і прыёмаміпрацы з тэкстам на ўроку, дэманстрацыя асноўных метадаў і прыёмаў працы.
3. Арганізацыя абмеркавання, дыскусіі, дзе кожны ўдзельнік мае магчымасць выказаць сваё меркаванне, даць ацэнку майстар-класу.

**Даведаюцца:**
што такое функцыянальная адукаванасць;
віды функцыянальнай адукаванасці;
метадычныя прыёмы працы з тэкстам на ўроку дзеля развіцця функцыянальнай адукаванасці.
**Змогуць навучыцца:**
самастойна будаваць сістэму работы з тэкстам на ўроку на прыкладзе работы майстра.
**Тэхнічнае і метадычнае забеспячэнне:** мультымедыйны праектар ці мульцiборд, раздатачны матэрыял.

## ХОД МАЙСТАР-КЛАСА

*I. Арганізацыйны этап*

*Мэта:* арганізацыя ўдзельнікаў на работу і гатоўнасць да педагагічнага ўзаемадзеяння.

- Прывітанне. Выберыце картку таго колеру, які адпавядае вашаму настрою, характару ці проста падабаецца (*прыём выкарыстоўваецца для фарміравання груп*)

*II. Матывацыйны этап*

*Мэта:* матывацыя на дзейнасць, абгрунтаванне выбару тэмы, яе актуальнасці, азнаямленне з этапамі работы, апісанне зместу дзейнасці.

- Падыміце рукі тыя, хто ведае беларускую народную казку "Лёгкі хлеб"? Чым яна запомнілася вам? Успомніце, як касар вучыў ваўка здабываць хлеб? Так і мы сёння пазнаёмімся з актуальнай адукацыйнай тэмай, дастанем назапашаныя веды са свайго педагагічнага багажу і паглыбім іх, а таксама пазнаёмімся з практычнай і значнай інфармацыяй. А ў канцы нашай работы абмяркуем вынікі.Кожны ўдзельнік зможа выказаць сваё меркаванне і даць ацэнку майстар-класу.

*Заданне:* на дошцы вы бачыце імправізаваную мадэль "Дрэва мудрасці і жаданняў". Прымацуйце да дрэва з аднаго боку віды функцыянальнай адукаванасці вучняў, якія вы ведаеце ці развіваеце на сваіх уроках. (Настаўнікі кожнай групы пішуць на паперы і прымацоўваюць да мадэлі дрэва з аднаго боку віды функцыянальнай пісьменнасці (адукаванасці): натуральна-навуковая (прыродазнаўчая), матэматычная, фінансавая, камп'ютарная, медыйная, чытацкая.

- Малайцы! Вы добра валодаеце тэарэтычным матэрыялам. Але я прапаную дапоўніць мадэль "Дрэва мудрасці" прыёмамі, формамі і метадамі працы з тэкстам на ўроках мовы і літаратуры, а яшчэ засяродзіць увагу на развіццё крытычнага мыслення і чытацкай пісьменнасці (адукаванасці). Рэаліі часу патрабуюць, каб сучасны вучань быў функцыянальна адукаваным.

*III. Аб'яўленне тэмы і мэтавызначэнне.*

*Мэта:* сумесная пастаноўка мэты, задач і выяўленне чаканняў удзельнікаў.

- Абапіраючыся на тэму, уласныя веды, напішыце свае мэты, чаканні і жаданні, на якія вы разлічваеце ў ходзе працы, і прымацуйце іх з другога боку дрэва. (Аб чым вы даведаецеся? Чаму навучыцеся ў працэсе работы? Што прымеце для сваёй далейшай работы, а ад чаго адмовіцеся? (Адны члены групы пішуць на паперы і прымацоўваюць на дрэва мэты, чаканні і жаданні ад мерапрыемства, а другія запаўняюць ліст чаканняў, які раздадзены кожнай групе)

Работа груп па запаўненні "Ліста чаканняў", сумесная пастаноўка задач.

| Аб чым даведаемся? | Чаму навучымся? |
| --- | --- |

| | |
|---|---|
| Што такое функцыянальная адукаванасць;<br>што такое чытацкая адукаванасць, з чаго яна складаецца і як фарміруецца<br><br>Што набудзем у працэсе работы?<br>Новыя веды;<br>уменне працаваць у групе | Спосабам, метадам і прыёмам работы з тэкстам на ўроку па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці, чытацкай адукаванасці;<br>супрацоўнічаць у групах<br>Ад чаго адмовімся?<br>Ад пасіўнасці;<br>ад дрэннага настрою і няўпэўненасці ў сабе |

*IV. Актуалізацыясуб'ектыўнага вопыту ўдзельнікаў.*

*Мэта:* дыягностыка першаснага педагагічнага вопыту ўдзельнікаў, забеспячэнне актыўнасці ўдзельнікаў.

Прыём "Закончы фразу"

– А зараз паспрабуйце закончыць сказы:

1. Я ведаю, што функцыянальная адукаванасць – гэта…
2. Я ведаю, што функцыянальная адукаванасць уключае некалькі накірункаў. Гэта …
3. Я ведаю, што чытацкая адукаванасць – гэта…

*V. Інфармацыйна-дзейнасны этап.*

*Мэта:* паглыбленне ў тэарэтычныя асновы пазначаных пытанняў; знаёмства з прыёмамі, метадамі, спосабамі дзейнасці настаўніка-майстра на ўроках; стварэнне атмасферы калектыўнай працы.

Выступленне настаўніка-майстра. (Знаёмства з тэорыяй, правядзенне майстар-класа з вопыту работы)

– Увага да функцыянальнай пісьменнасці – гэта не даніна модзе, а неабходнасць забеспячэння моладзі канкурэнтаздольнасці на рынку працы, паспяховасці ў жыцці.

Што ж такое функцыянальная пісьменнасць? Гэта комплекс здольнасцяў, якія забяспечваюць выяўленне, ідэнтыфікацыю і рашэнне жыццёвых праблем, што дае чалавеку магчымасць адаптавацца ў соцыуме і паспяхова ў ім функцыянаваць, узаемадзейнічаць.

Разгледзім адзін з накірункаў функцыянальнай пісьменнасці, выдзяліўшы асноўныя віды пазнавальнай дзейнасці і прыклады фармуліровак пытанняў і заданняў, якія адпавядаюць ідэі фарміравання гэтага канкрэтнага накірунку. Звернемся да фарміравання чытацкай пісьменнасці.

Чытацкая пісьменнасць(кампетэнтнасць) – гэта сукупнасць ведаў, уменняў і навыкаў, якіядазваляюць чалавеку адбіраць, арганізоўваць інфармацыю і паспяхова яе выкарыстоўваць у асабістых і грамадскіх мэтах. Гэта здольнасць чалавека чытаць, разумець, асэнсоўваць, ацэньваць і выкарыстоўваць тэксты для пашырэння ўласных

магчымасцяў, рашэння асобасных задач, а таксама ўсебаковага ўдзелу ў жыцці грамадства.

Для фарміравання чытацкага ўменне знаходзіць і выбіраць інфармацыю з тэксту рэкамендуецца прапаноўваць заданні ў якіх:

- паміж тэкстам пытання і адказам няма адназначнай лексічнай адпаведнасці (адказ нельга знайсці па ключавых словах пытання, адказ і пытанне неабходна разумець);
- фрагмент тэксту, які ўтрымлівае адказ на пытанне, неабходна вычленіць з кантэксту, які змяшчае залішнюю інфармацыю;
- патрабуецца працаваць з графічнай інфармацыяй, выбіраць інфармацыю, арыентуючыся на подпісы пад малюнкам, назвы слупкоў дыяграмы, назвы табліц, схем.

Для фарміравання чытацкага ўменне інтэграваць і інтэрпрэтыраваць паведамленні тэксту рэкамендуецца прапаноўваць заданні ў якіх прапануецца:

- аб'ядноўваць інфармацыю вербальную і графічную;
- устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж адзінкамі інфармацыі тэксту, рабіць высновы на падставе тэксту;
- адрозніваць галоўнае ад другараднага;
- адказваць на пытанні, якія маюць некалькі правільных адказаў;
- знаходзіць падабенства ў супрацьлеглых пунктах гледжання, адрозніваць агульнапрынятую і аўтарскую трактоўку падзеі.

Для фарміравання чытацкага ўменне асэнсоўваць і ацэньваць паведамленне тэксту рэкамендуецца прапаноўваць заданні, у якіх патрабуецца:

- разважаць аб інфармацыі, якая паведамляецца ў тэксце; выказваць згоду ці не згоду з аўтарскай пазіцыяй, матываваць яе (згоду), спасылаючыся на свій асабісты вопыт ці веды, якія не ўтрымліваюцца ў тэксце;
- параўноўваць прачытанае з тым, што чыталі раней, і са сваім жыццёвым вопытам;
- прагназаваць падзеі, якія адбудуцца далей у тэксце;
- апісваць асноўныя характарыстыкі прачытанага тэксту (структуру тэксту, яго стыль і інш.).

Чытацкая пісьменнасць патрабуе сфарміраванасці наступных уменняў: 1) знайсці і выбраць інфармацыю (арыентацыя ў змесце тэксту); 2) інтэграваць і інтэрпрэтаваць тэкст; 3) асэнсаваць і ацаніць (рэфлексія на змест тэксту і яго ацэнка). Названыя ўменні фарміруюцца на ўроках мовы і літаратуры пры працы з падручнікам.

На сваіх уроках выкарыстоўваю заданні для розных узроўняў работы з тэкстам: пазнавальнага, аналітычнага, творчага. Для набыцця і

засваення ведаў прапаную вучням наступныя заданні – скласці схему, запоўніць табліцу, скласці пашпарт. Але не ўсе вучні самастойна могуць выканаць такія заданні. Таму пры рабоце з тэкстамі на ўроках прапаную выкарыстоўваць памяткі. Напрыклад:

Памятка “Згортванне тэкставай інфармацыі ў табліцу”.

1. Прачытайце ўрывак з параграфа.
2. Прааналізуйце, што з’яўляецца значным у тэксце.
3. Падбярыце назвы слупкоў табліцы.
4. Запоўніце табліцу.
5. Зрабіце выснову.

Выкарыстоўваю наступныя прыёмы работы з тэкстам:

1. Знаходжанне ключавых слоў у тэксце.
2. Складанне плана тэксту (простага, разгорнутага).
3. Падбор радкоў з тэксту да апісання героя, карціны прыроды і г.д.
4. Пераводзіць інфармацыі з адной формы ў іншую – згортванне і разгортванне інфармацыі (схема – тэкст, тэкст – схема).
5. Састаўленне апорнага канспекта.
6. Складанне кластара.
7. Састаўленне пашпарта часціны мовы.

Пры арганізацыі дзейнасці на аналітычным узроўні прапаную наступныя заданні:

1. Аналіз малюнкаў, табліц, схем і іх дапаўненне.
2. Параўнане учынкаў, з’яў, падзей.
3. Знаходжанне прычынна-выніковых сувязяў.
4. Складанне характарыстыкі герояў твора.

Пры індывідуальнай рабоце з тэкстам вучэбнага дапаможніка часта прашу адзначыць простым алоўкам месцы па прынцыпе “+” – ужо ведаў, “!” – новае для мяне, “ – ” – думаў інакш, “?” – незразумела.

Пры рабоце ў парах прапаную вучням прачытаць патрэбны ўрывак з тэксту падручніка і задаць адзін аднаму пытанні.

Таксама пры рабоце з тэкстам мастацкага твора ці правілам вучэбнага дапаможніка можна выкарыстоўваць метад “Кубік Блума”. Вучань падкідае кубік, на гранях якога напісаны словы “Чаму?”, “Растлумач”, “Назаві”, “Прапануй”, “Прыдумай”, “Падзяліся”. З таго слова, якое выпадае вучню на грані кубіка, пачынаецца пытанне ці заданне, якое прапануе настаўнік. У моцным класе можна прапанаваць вучням скласці пытанні і заданні па тэме, пачынаючы іх словамі, якія выпалі на грані кубіка. Гэты метад можна прымяняць і пры франтальным апытанні дамашняга задання. (Настаўнікам у кожнай групе прапануецца прыдумаць пытанні і заданні на прымяненне гэтага метаду. Адна група прыдумвае заданні па мове, напрыклад, да тэмы “

Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа. Літаратурная мова і народныя гаворкі”, а другая група – па літаратуры. Вынікі агучваюцца кожнай групай з прымяненнем кубіка.)

А зараз давайце саставім пашпарт назоўніка і прыметніка, якія пражываюць у краіне Марфалогія. Кожнай групе раздаюцца карткі, якія трэба запоўніць. Напрыклад,

| |
|---|
| Я__________, абазначаю________________________, адказваю на пытанні________________, мая пачатковая форма________________, мае марфалагічныя прыметы__________________, працую ў суседняй дзяржаве Сінтаксіс у якасці_______________________, магу выконваць ролю_________________________________. |

Часта на сваіх урокахпрымяняю заданні на развіццё ўмення знайсці і выбраць інфармацыю. Напрыклад, прыем “Так – не”.

– Ці ёсць у беларускай мове літары, якіяне абазначаюць гукаў?(Так, ь.)

– Ці ёсць у беларускай мове словы, у якіх гукаў у два разы больш, чым літар? (Так, яе, я.)

– Ці праўда, што гук [й ] – цвёрды, а гук [ў] – мяккі? (Не.)

Прыем “Рэшата”.

Расказаць толькі пра тыя падзеі, якія адбыліся з дзедам Агеем у апавяданні “Цітаўкі”.

Прыем “Карэктар”.

Вучням прапануецца тэкст (ці частка тэкстку) са скажонымі фактамі, а ім трэба выправіць памылкі.

Для развіцця ўмення інтэграваць і інтэрпрэтаваць тэкст можна прапанаваць заданне “Адзін дзень з жыцця героя”. Вучні спрабуюць уявіць сябе прапанаваным героем і расказаць аб “сабе”, абапіраючыся на тэкст, напрыклад, адзін дзень з жыцця Костуся з апавядання “Цітаўкі” ці адзін дзень з жыцця Славіка Шыковіча з рамана “Сэрца на далоні”.

Прыем “Узаемаапытванне”.

На аснове інфармацыі з тэксту скласці пытанні і задаць іх аднакласнікам (работа ў групах).

Прыем “Інтэрв’ю з героем”.

Скласці пытанні да героя твора. Пытанні павінны быць асэнсаванымі, выцякаць з логікі твора.

Заданні на развіццё ўмення асэнсаваць і ацаніць інфармацыю з тэксту.

Прыем “Сінквейн 3+2+1”.

Вучань агучвае тры думкі, якія ён зразумеў;

называе дзве справы, якія б хацеў здейсніць у адносінах да герояў, што хацеў бы змяніць;

задае адно пытанне, якое хвалюе пасля чытання твора.

Прыем “СМС”.

Напісаць СМС пра прачытаную гісторыю.

Прыем “Ліст галоўнаму герою”.

У пісьмовай форме звярнуцца да героя твора, які спадабаўся ці не спадабаўся.

*VI. Падвядзенне вынікаў.*

– Фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці вучняў – адна з асноўных задач сучаснага педагога. Гэта няпросты працэс, які патрабуе ад настаўніка крэатыўнасці і творчага мыслення, але фарміраванне функцыянальнай пісьменнасці дапаможа выхаваць самастойную асобу, якая будзе здольная адаптавацца ў сучасным зменлівым свеце.

Пасля выступлення ўдзельнікі каменціруюць пачутае, убачанае, выказваюць свае меркаванні, задаюць пытанні.

*VII. Рэфлексія “Далонь”.*

*Мэта:* асэнсаваць атрыманы вопыт, высветліць праблемныя моманты, сістэматызаваць інфармацыю і ацаніць псіхалагічную атмасферу.

Для правядзення выкарыстоўваецца малюнак далоні. Малюем далонь, кожны палец – гэта пазіцыя, па якой неабходна выказаць сваё меркаванне:

Вялікі палец – для мяне было важным і цікавым…

Указальны – па гэтым(ых) пытанні(ях) я атрымаў(ла) канкрэтную інфармацыю…

Сярэдні – мне было цяжка (мне не спадабалася)…

Безыменны – мая ацэнка псіхалагічнай атмасферы…

Мезенец – для мяне было недастаткова…

Задача кожнага – расказаць пра свой удзел у майстар-класе і падзяліцца ўражанняміаб яго правядзенні. Меркаванні можна выказаць у вуснай ці пісьмовай форме.